# ТЫДНІ ГЕРМАНІІ
## 22 верасня – 31 кастрычніка 2017
## ПРАГРАМА

| Дата | Час | Мерапрыемства | Месца правядзення |
|---|---|---|---|
| 22.09.<br>пятніца | 13.00-16.30 | **«Хаім Суцін – уплыў нямецкага мастацтва»**<br><br>Даклад «Культурныя і сацыяльныя асаблівасці яўрэйскіх мястэчак Беларусі ў гістарычным кантэксце канца XIX - пачатку XX ст.» (доктар Інна Герасімава)<br><br>Напярэдадні II. Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ў маі 2018 г. у Мінску і Смілавічах, якая прысвечана вялікаму мастаку Хаіму Суціну і яго асяроддзю, у верасні 2017 – красавіку 2018 гг. запланавана правядзенне серыі воркшопаў з удзелам вядучых навукоўцаў свету. Першы воркшоп прысвечаны ўплыву нямецкай культуры і мастацтва на жыццё і творчасць ураджэнцаў Беларусі – мастакоў Парыжскай школы (Марка Шагала, Осіпа Любіча, Шрагі Царфіна, Роберта Геніна). Яго правядуць два эксперты з Германіі, якія працуюць з названай праблематыкай – прафесар Міхаэла Бёміг (загадчык кафедры рускай мовы і літаратуры Неапалітанскага ўніверсітэта «L'Orientale») і доктар Інна Герасімава, аўтар шматлікіх даследаванняў пра гісторыю і культуру беларускіх яўрэяў і пра мастакоў Парыжскай школы.<br><br>Уваход вольны<br><br>*Культурны фонд «Спадчына і час», Пасольства Германіі ў Мінску* | Музей Хаіма Суціна<br><br>вул. Рэвалюцыйная, 20<br>Смілавічы |
| 22.09.<br>пятніца | 18.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах:**<br>**Літаратурныя чытанні з Яўгенам Брэйгерам**<br><br>Адкрыццё тыдняў Германіі ў Баранавічах.<br>Знаёмства з аўтарам. Паэтычныя чытанні і абмеркаванне кнігі.<br>На нямецкай мове<br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |
| 22.09.<br>пятніца | 18.30-20.00 | **Лекцыя «Жыццё пражытае наперад і зразуметае назад - Вусная гісторыя як крыніца гістарычных даследаванняў»**<br><br>Рэферэнт: Ульрыка Юрайт, доктар філасофіі (Гамбург)<br><br>Гістарычная навука доўга і цяжка спрацоўвалася з накірункам вуснай гісторыі. Зараз зварот да гістарычнага вопыту можна ахарактарызаваць як стала выкарыстоўваемы. Дазволіць камусьці ўзгадваць сваё жыццё, і тады яго біяграфічны наратыў вызначыцца тым, што можа быць | Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна<br><br>вул. Сухая, 25<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | названа канцэптуальна тэрмінам *Вопыт*. Лекцыя будзе сканцэнтравана на чатырох пастаноўках пытанняў: па-першае, сістэматычна запісваць узаемазалежнасці падзей, вопыту, памяці і аповяду (I), у далейшым асвятляць гэтую біяграфічную камунікацыю ў яе апавядальнай структуры (II), па-трэцяе, інтэрв'ю само па сабе можа быць зразумета ў якасці сцэнічнага месца памяці (III), і, нарэшце, будзе абмеркавана сувязь паміж расказанай гісторыяй жыцця і абагульненнем, падказваемым праз індывідуальны выпадак (IV).<br>На нямецкай мове з беларускім перакладам<br>Уваход вольны<br><br>*Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна, Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Іаганеса Рау (ММАЦ)* | |
| 22.09.-<br>31.10. | | **Выстава «Францыск Скарына і яго эпоха»**<br><br>У рамках выставы «Францыск Скарына і яго эпоха» з нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прадстаўлены два экспанаты з Германіі: фрагмент Біблії Гутэнберга і Біблія Францыска Скарыны ў арыгінале.<br>Адкрыццё выставы адбылося 14.09.2017.<br>Падрабязней на www.nlb.by.<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску* | Нацыянальная бібліятэка Беларусі<br><br>пр. Незалежнасці, 116<br>Мінск |
| 23.09.<br>субота | 11.00-17.30 | **«Хаім Суцін – уплыў нямецкага мастацтва»**<br><br>Даклад «Эмігранты з былой Расійскай імперыі ў Берліне 20-х гадоў» (прафесар Міхаэла Бёміг)<br>і<br>даклад «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі ў Германіі. XX стагоддзе. Пастаноўка пытанняў» (доктар Інна Герасімава)<br><br>Напярэдадні II. Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ў маі 2018 г. у Мінску і Смілавічах, якая прысвечана вялікаму мастаку Хаіму Суціну і яго асяроддзю, у верасні 2017 – красавіку 2018 гг. запланавана правядзенне серыі воркшопаў з удзелам вядучых навукоўцаў свету. Першы воркшоп прысвечаны ўплыву нямецкай культуры і мастацтва на жыццё і творчасць ураджэнцаў Беларусі – мастакоў Парыжскай школы (Марка Шагала, Осіпа Любіча, Шрагі Царфіна, Роберта Геніна). Яго правядуць два эксперты з Германіі, якія працуюць з названай праблематыкай – прафесар Міхаэла Бёміг (загадчык кафедры рускай мовы і літаратуры Неапалітанскага ўніверсітэта «L'Orientale») і доктар Інна Герасімава, аўтар шматлікіх даследаванняў пра гісторыю і культуру беларускіх яўрэяў і пра мастакоў Парыжскай школы<br><br>На нямецкай мове з беларускім перакладам<br>Уваход вольны<br><br>*Культурны фонд «Спадчына і час», Пасольства Германіі ў Мінску* | Галерэя TUT.BY<br><br>пр. Дзяржынскага, 57<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 23.09.<br>субота | 11.00-12.00 | **Пастаноўка ў рамках Тэатральнага тыдня для навучэнцаў «Школ: партнераў будучыні»**<br><br>Тэатральны тыдзень пачаўся 18.09.2017<br><br>Пасля бліскучых выступаў тэатральнай групы MOSG на фестывалі школьных тэатраў у у Санкт-Пецярбургу і Боне большасць удзельнікаў ужо скончыла школу. Настаў час заснаваць новую групу. Пад кіраўніцтвам тэатральных педагогаў Беджат Мехдіцадех і Ёахіма Хосбаха навучэнцы PASCH -школ, якія курыруюцца Інстытутам ім. Гётэ ў Мінску, на працягу аднаго тыдня будуць працаваць над невялікай пастаноўкай. Фінальнай кропкай тыдня будзе дэманстрацыя публіцы пастаноўкі на базе прымаючай гімназіі.<br><br>*Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Гімназія № 56<br><br>вул. Варанянскага, 11/2<br>Мінск |
| 26.09.<br>аўторак | 14.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Інтэлектуальная гульня «Kopfsturm»**<br><br>Інтэрактыўная віктарына «Kopfsturm» для школьнікаў 8–10 класаў, якая дапамагае праверыць эрудыцыю ў розных галінах ведаў. Пытанняў – мноства, пераможца – адзін.<br><br>На нямецкай мове<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Сярэдняя школа № 14<br><br>вул. Піянерская, 98<br>Баранавічы |
| 26.09.<br>аўторак | 19.00 | **Канцэрт да 250-годдзя з дня смерці Г. Ф. Тэлемана**<br><br>У 21-м стагоддзі падаецца дзікім той каментар, якім у 1723 годзе лейпцыгская кансісторыя суправадзіла сваё рашэнне аб прызначэнні Ёгана Себасцьяна Баха на пост кантара царквы Св. Тамаша: «Не маючы лепшага, мы павінны задавольвацца сярэднім». А «лепшым» і найбольш жаданым быў Георг Філіп Тэлеман, які напачатку таксама прэтэндаваў на пасаду, але ў апошнюю хвіліну адмовіўся ад удзелу ў конкурсе.<br><br>Менавіта Тэлемана сучаснікі лічылі «першым кампазітарам Германіі», яго аўтарытэт быў бясспрэчным, а ў прадуктыўнасці яму не было роўных сярод кампазітараў той эпохі. Ва ўсіх жанрах – опера, царкоўная і камерная музыка – Тэлеман пакінуў творы, якія сведчаць аб неверагодным таленце і вялікім майстэрстве.<br><br>У 20-м стагоддзі галоўныя месцы ў «табелі аб рангах» эпохі Барока атрымалі іншыя – Ё.С. Бах, Г.Ф. Гендэль, А. Вівальдзі, але хутка стала відавочна, што музычны ландшафт 18-га стагоддзя быў бы няпоўным без фігуры Тэлемана: яго творы не толькі вытрымліваюць параўнанне з музыкай іншых знакамітых сучаснікаў, але і маюць пры гэтым абсалютна індывідуальны стыль. | Беларуская дзяржаўная філармонія (малая зала)<br><br>пр. Незалежнасці, 50<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | 250-й гадавіне з дня смерці Г.Ф. Тэлемана (1681-1767) прысвячае свой канцэрт ансамбль «Камерныя салісты Мінска» (мастацкі кіраўнік – Дзмітрый Зубаў). Камерныя творы кампазітара прагучаць 26 верасня ў Малой зале Белдзяржфілармоніі. Аматары старажытнай музыкі змогуць пачуць і рэдкія для Беларусі інструменты: блок-флейту, флейту-траверса, віёлу да гамба, барочны габой і барочны фагот.<br><br>Разам з добра знаёмымі мінскай публіцы Галінай Мацюковай, Аленай Мальцавай, Алегам Яцынам, Ілонай Лесь і Дзмітрыем Зубавым на сцэну выйдуць госці з Санкт-Пецярбурга: Канстанцін Якаўлеў і Русцік Пазюмскі.<br><br>*Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | |
| 26./27.09. | 18.00 | **«Shorts at Moonlight» - фестываль кароткаметражных фільмаў з Майнца ў Віцебску**<br><br>З 2010 года Таварыства дружбы Майнц-Мінск дэманструе ў рамках Тыдняў Германіі ў Беларусі кароткаметражныя фільмы нямецкага фестывалю «Shorts at Moonlight».<br>З больш чым 100 прагледжаных стужак былі адабраны лепшыя фільмы, якія будуць прадстаўлены публіцы ў Віцебску на працягу двух вечароў.<br>Таварыства дружбы Майнц-Мінск было заснавана ў 1995 г. і з таго часу актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі розных мерапрыемстваў у Беларусі.<br><br>На нямецкай мове<br><br>Уваход вольны<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску, Таварыства дружбы Майнц-Мінск, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт* | Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт<br>Мастацка-графічны факультэт<br>Аўд. 200<br><br>пр. Маскоўскі, 33/2<br>Віцебск |
| 27.09.<br>серада | 11.00-15.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: «Паляванне за скарбам» па-нямецку**<br><br>Папулярная ў Германіі гульня для дзяцей і падлеткаў. Удзельнікі выконваюць розныя заданні ў памяшканні і на адкрытым паветры. Мэта – знайсці «скарб».<br><br>Для школьнікаў 6–7 класаў<br><br>На нямецкай мове<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |
| 27.-30.09. | 19.00 | **Вечары нямецкага кіно**<br><br>На працягу чатырох вечароў Пасольства Германіі ў Мінску сумесна з Інстытутам імя Гётэ і кінатэатрам «Піянер» пакажа чатыры нямецкіх мастацкіх фільма: | Кінатэатр «Піянер»<br><br>вул. Энгельса, 20<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Серада, 27.09.: «Жыццё іншых» (Пераможца галасавання ў Facebook)<br>Чацвер, 28.09.: «У лабірынце маўчання»<br>Пятніца, 29.09.: «Бульвар Шонэфельд»<br>Субота, 30.09.: «Вымяраючы свет»<br><br>На нямецкай мове з рускімі субтытрамі<br><br>Уваход вольны (бясплатныя квіткі з 14.00 у фае кінатэатра)<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску, Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | |
| 28./29.09. | 18.00 | **Тыдні Германіі ў Полацку: «Shorts at Moonlight» - фестываль кароткаметражных фільмаў з Майнца ў Полацку**<br><br>З 2010 года Таварыства дружбы Майнц-Мінск дэманструе ў рамках Тыдняў Германіі ў Беларусі кароткаметражныя фільмы нямецкага фестывалю «Shorts at Moonlight».<br>З больш чым 100 прагледжаных стужак былі адабраны лепшыя фільмы, якія будуць прадстаўлены публіцы ў Полацку на працягу двух вечароў.<br>Таварыства дружбы Майнц-Мінск было заснавана ў 1995 г. і з таго часу актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі розных мерапрыемстваў у Беларусі.<br><br>На нямецкай мове<br><br>Уваход вольны<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску, Таварыства дружбы Майнц-Мінск, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | Полацкі калегіум (канцэртная зала)<br><br>вул. Стралецкая, 4<br>Полацк |
| 30.09.<br>субота | 10.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: фотамарафон «Дружба»**<br><br>Удзельнікі робяць12 фотаздымкаў за 12 гадзін  па 12 тэмах, рухаючыся па горадзе.<br>Лепшыя работы будуць прадстаўлены на фотавыставе «Дружба».<br><br>16+<br><br>Рэгістрацыя: https://vk.com/deutsche_woche<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |
| 30.09.<br>субота | 10.00 | **Фотамарафон «Дружба» ў Маладзечне**<br><br>Удзельнікі робяць12 фотаздымкаў за 12 гадзін  па 12 тэмах, рухаючыся па горадзе.<br>Лепшыя работы будуць прадстаўлены на фотавыставе «Дружба».<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Вялікі Гасцінец, 21-В3<br>Маладзечна |

| | | | |
|---|---|---|---|
| па 30.09. | | **Фотавыстава «ПА І СУПРАЦЬ ПЛЫНІ. СУЧАСНЫЯ ФОТАІНТЭРВЕНЦЫІ: №1 Вікторыя Біншток, №2 Міхаэль Шэфер» (ifa)**<br>У рамках Месяца фатаграфіі<br><br>Адкрыццё адбылося 7 верасня 2017.<br><br>У серыі выставаў «па і супраць плыні. Сучасныя фотаінтэрвенцыі» прадстаўлены фотамастакі з Германіі, якія распрацавалі новую вобразную мову ў мастацтве фатаграфіі. Наколькі б рознымі ні былі ўкладзеныя мастакамі сэнсы, іх творчы падыход аб‘ядноўвае актыўнае ўмяшальніцтва ў матэрыял сваіх кадраў. Такім чынам, адкрытым застаецца пытанне, наколькі дакументальнымі альбо рэалістычнымі застаюцца іх работы і дзе гэтыя межы пашыраюцца да фікцыі, выдумкі.<br><br>Экспазіцыя двух фотамастакоў – Вікторыі Біншток (нар. у 1972 г. у Маскве, жыве ў Берліне) і Міхаэля Шэфера (нар. у 1964 г. у Зігмарынгене, жыве ў Берліне) – будзе дэманстравацца ў верасні 2017 г. у Мінску. Абое выхоплiваюць кадры са сродкаў масавай інфармацыі і даследуюць іх функцыю. Наколькі аўтаномнымі могуць быць вобразы ў свеце, які ўсё больш і больш структураваны праз алгарытмы і сеткавыя ўзаемасувязі? Такі падыход звязвае Біншток і Шэфера з традыцыйнай мастацкай цікавасцю да СМІ, якая пачынаючы з 1970-х прымушала мастакоў пераадольваць межы дакументальнага.<br><br>Канцэпцыя выставы і выбар фатаграфій: Флорыян Эбнер, Крысцін Мюлер.<br><br>*Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў<br><br>вул. Някрасава, 3<br>Мінск |
| 1.10.<br>нядзеля | 17.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: «Shorts at Moonlight» – фестываль кароткаметражных фільмаў з Майнца ў Баранавічах**<br><br>З 2010 года Таварыства дружбы Майнц-Мінск дэманструе ў рамках Тыдняў Германіі ў Беларусі кароткаметражныя фільмы нямецкага фестывалю «Shorts at Moonlight».<br>З больш чым 100 прагледжаных стужак былі адабраны лепшыя фільмы, якія будуць прадстаўлены публіцы ў Баранавічах.<br>Таварыства дружбы Майнц-Мінск было заснавана ў 1995 г. і з таго часу актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі розных мерапрыемстваў у Беларусі.<br><br>14+<br><br>На нямецкай мове<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску, Таварыства дружбы Майнц-Мінск* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |

<table>
<tr><td>2.10.<br>панядзелак</td><td>18.30</td><td>«Shorts at Moonlight» - фестываль кароткаметражных фільмаў з Майнца ў Мінску<br><br>З 2010 года Таварыства дружбы Майнц-Мінск дэманструе ў рамках Тыдняў Германіі ў Беларусі кароткаметражныя фільмы нямецкага фестывалю „Shorts at Moonlight“.<br>З больш чым 100 прагледжаных стужак былі адабраны лепшыя фільмы, якія будуць прадстаўлены мінскай публіцы на працягу двух вечароў.<br>Таварыства дружбы Майнц-Мінск было заснавана ў 1995 г. і з таго часу актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі розных мерапрыемстваў у Беларусі.<br><br>На нямецкай мове<br><br>Уваход вольны<br><br>Інстытут нямецкіх даследаванняў (IfD), Пасольства Германіі ў Мінску, Таварыства дружбы Майнц-Мінск</td><td>БДУ<br>Факультэт міжнародных адносін<br>Аўд. 1301<br><br>вул. Ленінградская, 20<br>Мінск</td></tr>
<tr><td>3.10.<br>аўторак</td><td>11.00-12.00</td><td>Даклад «Ці існуе нямецкая культура?»<br><br>Дакладчык: Беатрыс Пэцальд<br><br>Паняцце «Народ паэтаў і мысліцеляў» з'явілася ў канцы 19 стагоддзя. Да гэтага часу Германія не была нацыянальнай дзяржавай і таму дзеячы культуры не былі немцамі ў сённяшнім сэнсе.<br><br>Такім чынам, што мы маем на ўвазе, калі гаворым пра культуру Германіі? Чаму ёй належыць Моцарт, які прапрацаваў усё сваё жыццё ў Вене? Падобна гэтаму з’яўляецца пытанне, як адносяцца да нямецкай культурнай спадчыны такія асобы як Бетховен, Гендэль і Вагнер?<br><br>Лекцыя пройдзе ў рамках сацыяльнага праекта для былых ахвяр Другой сусветнай вайны і дзяцей вайны «Дыялог пакаленняў». Запрашаюцца школьнікі і студэнты, якія маюць цікавасць да нямецкай мовы і культуры.<br><br>На нямецкай мове з рускім перакладам<br><br>Уваход вольны<br><br>Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна, Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Іаганеса Рау (ММАЦ)</td><td>Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна<br><br>вул. Сухая, 25<br>Мінск</td></tr>
<tr><td>3.10.<br>аўторак</td><td>18.30</td><td>«Shorts at Moonlight» - фестываль кароткаметражных фільмаў з Майнца ў Мінску<br><br>З 2010 года Таварыства дружбы Майнц-Мінск дэманструе ў рамках Тыдняў Германіі ў Беларусі кароткаметражныя фільмы нямецкага фестывалю „Shorts at Moonlight“.<br>З больш чым 100 прагледжаных стужак былі адабраны лепшыя фільмы, якія будуць прадстаўлены мінскай публіцы на працягу двух вечароў.</td><td>БДУ<br>Факультэт міжнародных адносін<br>Аўд. 601<br><br>вул. Ленінградская, 20<br>Мінск</td></tr>
</table>

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Таварыства дружбы Майнц-Мінск было заснавана ў 1995 г. і з таго часу актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі розных мерапрыемстваў у Беларусі.<br><br>На нямецкай мове<br>Уваход вольны<br><br>*Інстытут нямецкіх даследаванняў (IfD), Пасольства Германіі ў Мінску, Таварыства дружбы Майнц-Мінск* | |
| 4.10.<br>серада | 11.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Чытанне як прыгода «Eine Kiste Nichts» Лены Гесе**<br><br>Гучнае чытанне кнігі на нямецкай мове, літаратурныя гульні, творчая майстэрня.<br>Для школьнікаў 3–4 класаў<br>На нямецкай мове<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |
| 4.10.<br>серада | 10.00 | **Тыдні Германіі ў Полацку: Адкрыццё выставы «500 год Рэфармацыі»**<br><br>500 гадоў назад Марцін Лютэр размясціў свае 95 тэзісаў на дзвярах Замкавай царквы ў нямецкім горадзе Вітэнберг і тым самым паклаў пачатак Рэфармацыі. Яго 95 тэзісаў – гэта разважанні аб сумленні, чалавеку, унутранай свабодзе асобы.<br>Выстава расказвае не толькі пра жыццёвы шлях Марціна Лютэра – тэолага, пісьменніка, заснавальніка лютэранскай (пратэстантскай) царквы, чалавека, які пераклаў Біблію з лацінскай мовы на нямецкую, але і пра эпоху, у якой ён жыў, а таксама пра гісторыю Рэфармацыі ў цэлым.<br>Выкананы тыпаграфскім спосабам звод Тэзісаў унесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКА разам з трынаццаццю іншымі дакументамі Лютэра.<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт<br>Новы корпус (выставачная зала бібліятэкі)<br><br>вул. Блохіна, 30<br>Наваполацк |
| 4.10.<br>серада | 11.45 | **Тыдні Германіі ў Полацку: «Ланч-канцэрт»**<br><br>Жывая музыка вялікіх нямецкіх кампазітараў.<br><br>*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт<br>Новы корпус (фае)<br><br>вул. Блохіна, 30<br>Наваполацк |
| 4.10.<br>серада | 14.00 | **Тыдні Германіі ў Полацку: «Даведнік па Полацку»**<br><br>Прадстаўленне вынікаў міжнароднага праекта па стварэнні турыстычнага аўдыягіда на нямецкай мове па Полацку<br><br>*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | Полацкі калегіум<br><br>вул. Стралецкая, 4<br>Полацк |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4.10.<br>серада | 16.00 | **Тыдні Германіі ў Полацку: «Нямецкая мова з зайчыкам Гансам»**<br><br>Прадстаўленне вынікаў міжнароднага праекта Інстытута імя Гётэ ў Мінску і ПДУ па раннім навучанні нямецкай мове<br><br>*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD), Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Дзіцячы садок № 32<br><br>вул. Хруцкага, 20а<br>Полацк |
| 4.10.<br>серада | 18.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Нямецкае кіно**<br><br>У рамках «Вечароў нямецкага кіно» дэманструецца ў кінатэатры «Звязда» фільм «Вымяраючы свет» на нямецкай мове з рускімі субтытрамі<br><br>16+<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску, Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Кінатэатр «Звязда»<br><br>вул. Камсамольская, 11<br>Баранавічы |
| 4.10.<br>серада | 20.00 | **Канцэрт у рамках Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета «Ад Баха да Пьяцолы»**<br><br>У праграме:<br>І. С. Бах, Сюіта №2 Сі мінор для флейты з аркестрам<br>Р. Шуман, Канцэрт для віяланчэлі з аркестрам Ля мінор<br>А. Пьяцола, Канцэрт для банданеона з аркестрам (версія для акардэона)<br>А Пьяцола, Танга<br><br>East-West Chamber Orchestra і Расціслаў Крымер<br>Салісты: Давід Герынгас (віяланчэль), Германія<br>Ксенія Сідарава (акардэон), Латвія – Іспанія<br>Масіма Мерчэлі (флейта), Італія<br><br>Квіткі на www.bashmet-festival.com<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску* | Беларуская дзяржаўная філармонія (вялікая зала)<br><br>пр. Незалежнасці, 50<br>Мінск |
| 4. - 28.10. | | **11-ы Тыдзень нямецкай мовы і культуры ў Брэсце**<br>Праграма мерапрыемстваў у Брэсце на www.minsk.diplo.de | |
| 4./5.10. | 19.00 | **Вечары нямецкіх кароткаметражных фільмаў «SHORT EXPORT 2017»**<br><br>На працягу 12 гадоў АТ „Курцфільм“ сумесна з такімі партнёрамі як Інстытут імя Гётэ ў Ліёне і Міжнародным фестывалем кароткаметражнага кіно ў Клермон-Феране стварае старанна прадуманую праграму кароткаметражных фільмаў. Апошнія 11 гадоў гэта праграма пад назвай «Soirée Allemande – A crush on German Short Films» была з поспехам паказана ў філіялах Інстытута імя Гётэ па ўсім свеце. Актуальны 12-ы выпуск носіць з мінулага года новае імя «SHORT EXPORT – Made in Germany» .<br>Нягледзячы на змяненні ў назве і афармленні, у 12-м выпуску Вас чакае спалучэнне якаснага мастацкага, | Кінатэатр «Піянер»<br><br>вул. Энгельса, 20<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | дакументальнага і эксперыментальнага кіно, якое добра зарэкамендавала сябе. Нібы калейдаскоп, фільмы дэманструюць розныя бакі нямецкай рэальнасці і адкрываюць шматмерны вобраз Германіі. Кароткаметражныя фільмы суправаджаюцца рускімі субтытрамі.<br><br>Уваход вольны (бясплатныя квіткі з 14.00 у фае кінатэатра)<br><br>*Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | |
| 5.10.<br>чацвер | 10.30 | **Тыдні Германіі ў Полацку: «Wortschatzerweiterung mit Musik»**<br><br>Семінар лектара DAAD Георгіі Маціяс для студэнтаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта<br><br>*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | Полацкі калегіум<br>Аўд. 247<br><br>вул. Стралецкая, 4<br>Полацк |
| 5./6.10. | з 09.00 | **Міжнародная канферэнцыя «Горад, які навучаецца, для крэатыўнай эканомікі»**<br><br>У сучасным свеце канкурэнтаздольнымі з'яўляюцца тэрыторыі, дзе захаванне традыцый спалучаецца з інавацыйным развіццём эканомікі. Для гэтага патрабуецца інтэграцыя розных форм фармальнай і нефармальнай адукацыі для моладзі і дарослых у працэсы мясцовага развіцця. Асаблівую ролю ў мясцовым развіцці мае даступнасць вышэйшай адукацыі і адукацыі дарослых, якія забяспечваюць інавацыйнае развіццё эканомікі. Рэгіён або горад становяцца тэрыторыяй вытворчасці ведаў і навыкаў або «рэгіёнам/горадам, які навучаецца».<br>Рэспубліка Беларусь, якая займае 50-е месца ў Спісе краін па індэксе чалавечага развіцця, мае вялікі патэнцыял для ўкаранення міжнароднага вопыту супольнасцяў, якія навучаюцца. Перспектывы выкарыстання міжнароднага вопыту для развіцця гарадоў Беларусі будуць абмяркоўвацца на канферэнцыі «Горад, які навучаецца, для крэатыўнай эканомікі». У ходзе канферэнцыі будуць прадстаўлены канцэпцыі «горада, які навучаецца» і «крэатыўнай эканомікі», абмеркаваны перспектывы іх укаранення ў мясцовыя і рэгіянальныя стратэгіі ўстойлівага развіцця. Для прадстаўлення еўрапейскага вопыту запрошаны прадстаўнікі Інстытута ЮНЕСКА па навучанні на працягу ўсяго жыцця, Народнага ўніверсітэта г. Гельзенкірхен, адміністрацыі г. Рэгенсбург (ФРГ).<br>Мерапрыемства адрасавана, у першую чаргу, прадстаўнікам мясцовых органаў улады, бізнесу, устаноў адукацыі, культуры і сацыяльнай абароны, грамадскіх арганізацый з Гомелю і Віцебску.<br>Па дадатковую інфармацыю звяртайцеся, калі ласка, у офіс DVV International у Беларусі па тэлефонах +375 172079835, +375 291719397 ці электроннай пошце pristrom@dvv-international.by.<br><br>*Прадстаўніцтва Нямецкай Асацыяцыі народных універсітэтаў у Рэспубліцы Беларусь (DVV)* | Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ<br><br>вул. Маскоўская, 5<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 6.10.<br>пятніца | 10.30 | **Тыдні Германіі ў Полацку: «Крэатыўная работа з тэкстам»**<br><br>Метадычны семінар лектара DAAD Георгіі Маціяс для настаўнікаў нямецкай мовы Полацка і Наваполацка<br><br>*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | Полацкі калегіум<br>Аўд. 247<br><br>вул. Стралецкая, 4<br>Полацк |
| 6.10.<br>пятніца | 18.00 | **Літаратурнае кафэ**<br><br>Сучасная нямецкая літаратура: кансультант па нямецкай мове Цэнтральнага ўпраўлення па справах школьнай адукацыі за мяжой Вернер Ліберкнехт прапануе ўвазе ўдзельнікаў раманы для моладзі «Auerhaus» Бова Бьерга і «Vierzehn» Тамары Бах.<br>На нямецкай мове<br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральнае ўпраўленне па справах школьнай адукацыі за мяжой (ZfA)* | Цэнтр сучасных мастацтваў<br><br>вул. Някрасава, 3<br>Мінск |
| 6.10.<br>пятніца | 18.30-20.00 | **Прэзентацыя кнігі «Белавежская пушча: Дзікі зубр і сусветная спадчына, Гісторыя польска-беларускага Белавежскага нацыянальнага парку»**<br><br>Аўтары: Томас М. Бон, Аляксандр Далгоўскі, Маркус Кжоска<br>Дакладчык: Томас М. Бон, Аляксандр Далгоўскі<br><br>Размешчаную на польска-беларускай мяжы Белавежскую пушчу лічылі з 18-га стагоддзя апошнім прытулкам зубра, які амаль знік падчас Першай сусветнай вайны. Першапачаткова міжнароднае значэнне апошнія некранутыя раўнінныя лясы Еўропы атрымалі ў якасці паляўнічых угоддзяў польскіх каралёў і рускіх цароў, а затым у польскім і беларускім нацыянальным парку і, нарэшце, у якасці сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Кніга з’яўляецца першай навуковай манаграфіяй на адной з заходнееўрапейскіх моў, у якой разглядаецца гісторыя Пушчы ад Новага часу да сучаснасці.<br>На нямецкай мове з рускім перакладам<br>Уваход вольны<br><br>*Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна, Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Іаганеса Рау (ММАЦ)* | Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна<br><br>вул. Сухая, 25<br>Мінск |
| 7.10.<br>субота | 15.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Майстар-клас па роспісу сумак**<br><br>Знаёмства з этымалогіяй слоў, якія гучаць на нямецкай і беларускай мовах аднолькава. Распрацоўка і ўвасабленне ў жыццё дызайна сумак ручной работы.<br>14+<br>Рэгістрацыя: https://vk.com/deutsche_woche<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7.10.-3.12. | 11.00-19.00 | **Выстава «ЭРНСТ БАРЛАХ – КЕТЭ КОЛЬВІЦ. ПЕРААДОЛЬВАЮЧЫ ІСНАВАННЕ»**<br><br>Творы двух выбітных нямецкіх мастакоў-экспрэсіяністаў – Эрнста Барлаха (1870-1938) і Кетэ Кольвіц (1867-1945) – упершыню будуць прадэманстраваны ў Беларусі. На выставе прадстаўлены больш за 200 работ, якія адлюстроўваюць асноўныя этапы творчага шляху абодвух мастакоў з 1890 па 1945 гг.<br><br>*Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Таварыства Эрнста Барлаха ў Гамбугу, Пасольства Германіі ў Мінску, Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Нацыянальны мастацкі музей<br><br>вул. Леніна, 20<br>Мінск |
| 10.10.<br>аўторак | 14.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Круглы стол «Mein Deutsch ist PERFEKT!»**<br><br>Знаёмства з мінулым часам у нямецкай мове і спосабамі яго выражэння ў добразычлівай атмасферы.<br><br>14+<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Сярэдняя школа № 14<br><br>вул. Піянерская, 98<br>Баранавічы |
| 11.10.<br>серада | 18.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Нямецкае кіно**<br><br>У рамках «Вечароў нямецкага кіно» дэманструецца ў кінатэатры «Звязда» фільм «Усходні вецер» на нямецкай мове з рускімі субтытрамі.<br><br>12+<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску, Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Кінатэатр «Звязда»<br><br>вул. Камсамольская, 11<br>Баранавічы |
| 11./12.10. | 19.00 | **Спектакль «Шуфлядкі » ў рамках міжнароднага тэатральнага форуму «Тэарт»**<br><br>У спектаклі «Шуфлядкі» ўдзельніцы калектыву Шы Шы Поп, якія выраслі на Захадзе, сустракаюць сваіх аднагодак з былой ГДР, каб зліцца разам у сястрынскім пацалунку. Разам яны паказваюць «аб'яднанне Германіі» як пабудову адносін – заднім лікам і ў прамым эфіры на сцэне. Яны прыхільніцы шматгалосся і калектыўнага апавядання. Прабелы, недакладнасці і адсутныя звязкі з'яўляюцца часткай задумкі.<br>Кім мы былі? Кім мы сталі? Чаму мы сталі такімі?<br><br>Падрабязней на: http://www.teart.by/ru/program2017/international_program/v-yashchikah-stola.html<br><br>*Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Палац культуры МАЗ<br><br>пр. Партызанскі, 117а<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 12.10.<br>чацвер | 14.00 | **Адкрыццё вандроўнай выставы «Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць» у Брэсце**<br><br>У аколіцах вёскі Малы Трасцянец з 1942 да 1944 гг. існаваў найбуйнейшы лагер смерці на акупаванай тэрыторыі Савецкага Саюза. Дадзеная выстава, якая ўяўляе сабой беларуска-нямецкі праект, заклікана аддаць даніну памяці ахвярам Трасцянца і адначасова паказаць якім чынам і дзе ў Беларусі, Германіі, Аўстрыі і Чэхіі захоўваецца памяць аб загінулых. Мэта выставы - спрыяць таму, каб Малы Трасцянец замацаваўся ў грамадскай свядомасці як месца злачынстваў нацызму і помнік еўрапейскага значэння. Двухмоўная выстава - вынік міжнароднага дыялогу з удзелам гісторыкаў з Беларусі, Германіі, Аўстрыі і Чэхіі, які пачаўся ў 2014 г. У Германіі дадзеная выстава была адкрыта 8 лістапада 2016 г. у Гамбургу. У Беларусі яна была паказана ў Мінску, Маладзечне і Гродне. У рамках выставы пройдуць экскурсіі, сустрэчы са сведкамі часу і спецыялізаваныя лекцыі для моладзі.<br><br>Уваход вольны<br><br>*Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна, Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Іаганеса Рау (ММАЦ)* | Брэсцкая крэпасць<br>Выставачная зала каля Холмскай брамы<br><br>Брэст |
| 12.10.<br>чацвер | 19.00 | **Аўтарскія чытанні з Манфрэдам Тайзэнам у Мінску**<br><br>Манфрэд Тайзэн вывучаў германістыку, англістыку і паліталогію, на працягу двух гадоў ён праводзіў даследаванні ў Савецкім Саюзе для Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама кіраваў рэдакцыяй штодзённай газеты. Яго кнігі адзначаны шэрагам прэмій, яны станавіліся выбарам радыёслухачоў і былі перакладзены на мноства моў.<br><br>Чытанне ўрыўкаў з «Чэкпойнт Еўропа» і «Адзін з адзінаццаці» - гэта і чытанне, і размова. У прыватнасці, аўтар распавядзе пра свой вопыт працаёмкага пошуку. Выбарачна зачытваючы кароткія ўрыўкі, ён пазнаёміць слухачоў з сапраўдным падтэкстам твораў.<br><br>**«Чэкпойнт Еўропа – уцёк у новае жыццё»**<br>(выдавецтва cbt, 2016)<br>Гісторыя кахання, трылер і падарожжа ў пошуках сябе — усё гэта і ёсць «Чэкпойнт Еўропа». Раман таксама дае глыбокае разуменне сучаснай дыскусіі аб бежанцах.<br>Сюжэт: Базіль уцякае з Сірыі ў Германію, дзе ён спрабуе асталявацца. Але ён страціў на вайне не толькі сваіх бацькоў, але і сваё каханне: Захру. Ён і яна разлучыліся падчас уцёкаў. Таму Базіль адпраўляецца шукаць яе, але прывіды мінулага праследуюць яго. У незвычайнае падарожжа адпраўляецца і журналіст Табіяс, які неадступна ідзе за Базілем, каб напісаць раман – раман пра жыццё, якое яшчэ такое маладое, але ўжо перажыло болей, чым любое іншае жыццё.<br><br>«Тайзэн вядзе аповед з пункту гледжання хлопца, дакладна перадаючы атмасферу і выкарыстоўваючы нечаканыя | Інстытут імя Гётэ<br><br>вул. Веры Харужай, 25/3<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | павароты. » (Berliner Zeitung)<br>«…Кароткімі сказамі імкліва расказаны раман… Манфрэд Тайзэн творам «Чэкпойнт Еўропа» закранае многія пытанні, не даючы адказаў. Яму неабходны дарослы чытач, які павінен сам сфарміраваць сваё меркаванне.» (Süddeutsche Zeitung)<br><br>**«Адзін з адзінаццаці»** (выйдзе ў свет вясной 2018 г., выдавецтва Loewe)<br>«Давай! Давай! Давай!»<br>Гэта ўсхваляваны голас памочніка трэнера. Я здымаю манішку і размінiчную майку, адчуваю паветра і, нягледзячы на спёку, у мяне па скуры прабягаюць мурашкі. Потым я апранаю футболку. Яна чорна-белая і з маім прозвішчам. У маёй галаве аддаецца стук песень фанатаў, і ў маіх грудзях сэрца б’ецца, як машына.<br>Трэба супакоіцца. Спакойна.<br><br>Аўтар з Кёльна Манфрэд Тайзэн адказвае ў сваёй кнізе «Адзін з адзінаццаці» на пытанне, якое многія ставілі перад сабой хоць аднойчы: «Што адбываецца ў галаве футбаліста каманды Германіі адразу перад тым, як ён выйдзе на замену ў гульні ўсяго яго жыцця?»<br>У хуткім патоку думак падзеі на стадыёне пераблытваюцца з падзеямі з жыцця прафесіянальнага футбаліста. Таму што на дзяцінства дзіцяці нігерыйца і немкі гэта асаблівым чынам наклала адбітак – быць іншым.<br>Але на футбольным полі ўсе адрозненні не маюць значэння. Ніякага расізму!<br>Таму што тут ён «АДЗІН з адзінаццаці».<br><br>На нямецкай мове<br>Уваход вольны<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску, Цэнтральнае ўпраўленне па справах школьнай адукацыі за мяжой (ZfA), Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | |
| 13.10.<br>пятніца | 10.00-18.00 | **«Напісанне тэкстаў па-новаму»: семінар, прысвечаны чытанню і напісанню тэкстаў, і новыя медыя-сродкі з Манфрэдам Тайзэнам**<br><br>Натхнёныя прагледжанымі відэакліпамі, удзельнікі семінара пішуць і затым чытаюць уголас свае тэксты. Яны ўключаюць іх у відэаролікі, дадаюць музыку і тым самым ствараюць літаратурныя творы, якія можна чытаць, слухаць і глядзець. Так пакаленне Ю-Тубу навучаецца абыходзіцца са створанымі і агучанымі ім тэкстамі па-новаму. Часта паўстаюць вершы, а таксама кароткія гісторыі. Мова і сам тэкст набываюць у вачах удзельнікаў асаблівае значэнне, бо ў канцы ён становіцца часткай адпаведнага прадукту з медыя-сферы. Такім чынам, удзельнікі не толькі асвойваюць крэатыўнае пісьмо, але і навучаюцца творча абыходзіцца з новымі медыя-сродкамі. Потым вынікі творчасці (відэаролікі) паказваюць у бібліятэках, падчас бацькоўскіх сходаў альбо школьных вакацый. Гэты метад стварэння тэкстаў падыходзіць таксама і для дарослых. | Інстытут імя Гётэ<br><br>вул. Веры Харужай, 25/3<br>Мінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | На нямецкай мове<br>Рэгістрацыя: bibl@minsk.goethe.org<br><br>*Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | |
| 14.10.<br>субота | 13.00-17.00 | **Тэатральны фестываль школ-удзельніц ініцыятывы «Школы: партнёры будучыні»**<br><br>Ужо ў трэці раз Цэнтральнае ўпраўленне па справах школьнай адукацыі за мяжой сумесна з Інстытутам імя Гётэ ў Мінску праводзяць тэатральны фестываль. Тэатральныя групы школ-партнёраў прадставяць на фестывалі пастаноўкі на нямецкай мове, працягласцю ў адну гадзіну. Ад казак да літаратурных адаптацый - усё дазволена і без ціску канкурэнцыі і конкурснага характару. Натхнёныя гульнёй навучэнцы ўсіх узростаў і з розным узроўнем валодання мовы могуць атрымаць магчымасць выступіць на сцэне. Мерапрыемства адкрыта для ўсіх зацікаўленых.<br><br>Уваход вольны<br><br>*Інстытут імя Гётэ ў Мінску, Цэнтральнае ўпраўленне па справах школьнай адукацыі за мяжой (ZfA)* | Гімназія № 20<br><br>вул. Адзінцова, 89<br>Мінск |
| 14.10.<br>субота | 16.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Чамадан гісторый «Eine Kiste Nichts» Лены Гесе**<br><br>Гучнае чытаннне кнігі на рускай мове, літаратурныя гульні, творчая майстэрня.<br><br>3+<br>Рэгістрацыя https://vk.com/deutsche_woche<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |
| 15.10.<br>нядзеля | 16.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Паэтычнае караоке**<br><br>Імправізаваныя творчыя чытанні на нямецкай, беларускай, рускай мовах. Літаратурная дыскусія.<br><br>16+<br>Рэгістрацыя: https://vk.com/deutsche_woche<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Кафэ „Pizza&Coffee“<br><br>вул. Савецкая, 74А<br>Баранавічы |
| 16.10.<br>панядзелак | 11.30 | **Аўтарскія чытанні з Манфрэдам Тайзэнам у Пінску**<br><br>Манфрэд Тайзэн вывучаў германістыку, англістыку і паліталогію, на працягу двух гадоў ён праводзіў даследаванні ў Савецкім Саюзе для Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама кіраваў рэдакцыяй штодзённай газеты. Яго кнігі адзначаны шэрагам прэмій, яны станавіліся выбарам радыёслухачоў і былі перакладзены на мноства моў.<br><br>Чытанне ўрыўкаў з «Чэкпойнт Еўропа» і «Адзін з адзінаццаці» - гэта і чытанне, і размова. У прыватнасці, аўтар распавядзе пра свой вопыт працаёмкага пошуку. | Гімназія № 2<br><br>вул. Ільіна, 13<br>Пінск |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Выбарачна зачытваючы кароткія ўрыўкі, ён пазнаёміць слухачоў з сапраўдным падтэкстам твораў.<br><br>**«Чэкпойнт Еўропа – уцёк у новае жыццё»**<br>(выдавецтва cbt, 2016)<br>Гісторыя кахання, трылер і падарожжа ў пошуках сябе — усё гэта і ёсць «Чэкпойнт Еўропа». Раман таксама дае глыбокае разуменне сучаснай дыскусіі аб бежанцах. Сюжэт: Базіль уцякае з Сірыі ў Германію, дзе ён спрабуе асталявацца. Але ён страціў на вайне не толькі сваіх бацькоў, але і сваё каханне: Захру. Ён і яна разлучыліся падчас уцёкаў. Таму Базіль адпраўляецца шукаць яе, але прывіды мінулага праследуюць яго. У незвычайнае падарожжа адпраўляецца і журналіст Табіяс, які неадступна ідзе за Базілем, каб напісаць раман – раман пра жыццё, якое яшчэ такое маладое, але ўжо пражыло болей, чым любое іншае жыццё.<br><br>«Тайзэн вядзе аповед з пункту гледжання хлопца, дакладна перадаючы атмасферу і выкарыстоўваючы нечаканыя павароты. » (Berliner Zeitung)<br>«…Кароткімі сказамі імкліва расказаны раман… Манфрэд Тайзэн творам «Чэкпойнт Еўропа» закранае многія пытанні, не даючы адказаў. Яму неабходны дарослы чытач, які павінен сам сфарміраваць сваё меркаванне.» (Süddeutsche Zeitung)<br><br>**«Адзін з адзінаццаці»** (выйдзе ў свет вясной 2018 г., выдавецтва Loewe)<br>«Давай! Давай! Давай!»<br>Гэта ўсхваляваны голас памочніка трэнера. Я здымаю манішку і размінaчную майку, адчуваю паветра і, нягледзячы на спёку, у мяне па скуры прабягаюць мурашкі. Потым я апранаю футболку. Яна чорна-белая і з маім прозвішчам. У маёй галаве аддаецца стук песень фанатаў, і ў маіх грудзях сэрца б’ецца, як машына.<br>Трэба супакоіцца. Спакойна.<br><br>Аўтар з Кёльна Манфрэд Тайзэн адказвае ў сваёй кнізе «Адзін з адзінаццаці» на пытанне, якое многія ставілі перад сабой хоць аднойчы: «Што адбываецца ў галаве футбаліста каманды Германіі адразу перад тым, як ён выйдзе на замену ў гульні ўсяго яго жыцця?»<br>У хуткім патоку думак падзеі на стадыёне пераблытваюцца з падзеямі з жыцця прафесіянальнага футбаліста. Таму што на дзяцінства дзіцяці нігерыйца і немкі гэта асаблівым чынам наклала адбітак – быць іншым.<br>Але на футбольным полі ўсе адрозненні не маюць значэння. Ніякага расізму!<br>Таму што тут ён «АДЗІН з адзінаццаці».<br><br>На нямецкай мове<br>Уваход вольны<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску, Цэнтральнае ўпраўленне па справах школьнай адукацыі за мяжой (ZfA), Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 17.10.<br>аўторак | с 12.30 | **«Эканоміка і экалогія»**<br><br>Мерапрыемства з нагоду адкрыцця Цэнтра нямецкай мовы, эканомікі і культуры ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце<br>Эканомнае абыходжанне з прыроднымі рэсурсамі – галоўная перадумова для ўстойлівага развіцця. Дадзенае мерапрыемства, якое праводзіцца зноў створаным Цэнтрам нямецкай мовы, эканомікі і культуры, накіравана на абуджэнне цікавасці навучэнцаў эканамічных спецыяльнасцей да таго, што адказнасць грамадства і разумнае з пункту гледжання навакольнага асяроддзя вядзенне эканомікі ўсё ў большых маштабах становіцца адной з стратэгічных мэтаў прадпрыемстваў, і што ахова клімату можа прыдаць імпульс эканамічнаму росту.<br>Падрабязней: www.vk.com/Deutschzentrum_BSWU<br><br>*Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD), Пасольства Германіі ў Мінску, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт* | Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт<br><br>пр. Партызанскі, 26<br>Мінск |
| 18.10.<br>серада | 15.00 | **Эстафета.de - Stafette.by «Культурная спадчына» Заключнае мерапрыемства**<br><br>Эстафета стартавала: 11.09.2017<br>Усім, хто цікавіцца Германіяй, любіць нямецкую мову і творчасць! Дасылайце нам у рамках праекта DAAD «Эстафета.de - Stafette.by» аповяд з Вашым сэлфі, удзельнічайце ў нашым майстар-класе па фатаграфіях, у нашым фотаконкурсе або праверце Вашы веды па нямецкай мове і напішыце з намі дыктоўку. У 2017 годзе праект «Эстафета.de - Stafette.by» праходзіць пры падтрымцы Інстытута імя Гётэ і пад дэвізам «Культурная спадчына».<br>На Вашых тэкстах будуць пабудаваны наступныя этапы эстафеты, якія прывядуць да мэты, дзе Вас чакаюць цікавыя прызы. Праглядайце рэгулярна старонку нашага праекта vkontakte. Тут Вы знойдзеце далейшую інфармацыю і ўмовы ўдзелу. Далучайцеся і перадавайце эстафету далей! Мы будзем рады Вашаму ўдзелу. На заключным мерапрыемстве будуць звязаны разам усе часткі эстафеты.<br>Інфармацыя на сайце vkontakte: https://vk.com/stafette_by<br>Уваход вольны<br><br>*Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | ММАЦ імя І. Рау (канферэнц-зала)<br><br>пр. Газеты «Праўда», 11<br>Мінск |
| 18.10.<br>серада | 18.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Нямецкае кіно**<br><br>У рамках «Вечароў нямецкага кіно» дэманструецца ў кінатэатры «Звязда» фільм «У лабірынце маўчання» на нямецкай мове з рускімі субтытрамі.<br><br>16+<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску, Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Кінатэатр «Звязда»<br><br>вул. Камсамольская, 11<br>Баранавічы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 21.10.<br>субота | 11.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Семінар «Spiele im DaF-Unterricht»**<br><br>Семінар на тэму «Гульні на ўроках нямецкай мовы» для настаўнікаў нямецкай мовы і студэнтаў БарДУ. Лектар – Дар'я Арнольбік, настаўнік СШ № 14.<br><br>17+<br><br>На нямецкай мове<br><br>Рэгістрацыя: https://vk.com/deutsche_woche<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |
| 22.10.<br>нядзеля | 12.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Кірмаш «Букет дружбы»**<br><br>Удзельнічаючы ў конкурсах, віктарынах пра Германію і краіназнаўчых квэстах, госці кірмашу зарабляюць жэтоны, якія потым абменьваюць на вырабы ручной работы мясцовых рамеснікаў.<br><br>0+<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка / парк<br><br>Баранавічы |
| 23.-25.10. | 17.30 | **Вечары нямецкага кіно ў Гомелі**<br><br>На працягу трох вечароў з 23 па 25 кастрычніка Пасольства Германіі ў Мінску сумесна з Інстытутам імя Гётэ і кінатэатрам «Мір» пакажа тры нямецкіх мастацкіх фільма:<br><br>«Жыццё іншых», рэж. Флорыян Хенкель фон Донерсмарк, 137 хв., 2006<br>«Зачотны прэпад», рэж. Бор Дагтекін, 113 хв., 2013<br>«Усходні вецер», рэж. Каця фон Гарнье, 105 хв., 2013<br><br>На нямецкай мове з рускімі субтытрамі<br><br>Уваход вольны<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску, Інстытут імя Гётэ ў Мінску* | Кінатэатр «Мір»<br><br>вул. Ільіча, 51Б<br>Гомель |
| 27.-29.10. | | **Семінар па краіназнаўстве «Адкрыць Германію»**<br><br>Сёлета семінар па краіназнаўстве «Адкрыць Германію» пройдзе ў Гомелі, дзе ўдзельнікі адзначаць яго 10-гадовы юбілей. 70 студэнтаў з усіх універсітэтаў Беларусі правядуць з лектарамі DAAD і іншымі рэферэнтамі з Германіі падоўжаныя выхадныя ў Гомельскім гандлёва-эканамічным універсітэце і Гомельскім дзяржаўным універсітэце і прымуць удзел у розных мерапрыемствах на шматлікія тэмы, пачынаючы ад краіназнаўства і | Гомельскі гандлёва-эканамічны універсітэт<br><br>Пр. Кастрычніка, 50<br>Гомель<br><br>Гомельскі дзяржаўны універсітэт |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | заканчваючы культурай, эканомікай і мовай. Акрамя таго, удзельнікам будзе прапанавана культурная праграма, да стварэння якой творча падыйшлі студэнты семінара.<br><br>*Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD)* | вул. Савецкая, 102<br>Гомель |
| 28.10.<br>субота | 17.00 | **Тыдні Германіі ў Баранавічах: Фотовыстава «Дружба»**<br><br>Закрыццё Тыдняў Германіі ў Баранавічах. Лепшыя работы фотамарафона ў фармаце фотасушкі. Жывая музыка. Узнагароджанне пераможцаў.<br><br>Уваход вольны<br><br>*Цэнтральная гарадская бібліятэка, Пасольства Германіі ў Мінску* | Цэнтральная гарадская бібліятэка<br>Аддзел замежнай літаратуры<br><br>вул. Леніна, 53<br>Баранавічы |
| 31.10.<br>аўторак | 18.00 | **Адкрыццё выставы «500 год Рэфармацыі» і канцэрт у Гродне**<br><br>У рамках урачыстага канцэрта Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія Петэр Дэтмар адкрые прысвечаную Марціну Лютэру выставу #hereistand.<br><br>500 гадоў назад Марцін Лютэр размясціў свае 95 тэзісаў на дзвярах Замкавай царквы ў нямецкім горадзе Вітэнберг і тым самым паклаў пачатак Рэфармацыі. Яго 95 тэзісаў – гэта разважанні аб сумленні, чалавеку, унутранай свабодзе асобы.<br><br>Выстава расказвае не толькі пра жыццёвы шлях Марціна Лютэра – тэолага, пісьменніка, заснавальніка лютэранскай (пратэстанцкай) царквы, чалавека, які пераклаў Біблію з лацінскай мовы на нямецкую, але і пра эпоху, у якой ён жыў, а таксама пра гісторыю Рэфармацыі ў цэлым.<br>Выкананы тыпаграфскім спосабам звод Тэзісаў унесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКА разам з трынаццаццю іншымі дакументамі Лютэра.<br><br>*Пасольства Германіі ў Мінску* | Евангеліцка-Лютэранская Царква св. Іаана<br><br>вул. Акадэмічная, 7А<br>Гродна |

*Падчас Тыдняў Германіі на старонцы ў фэйсбуку шэф-рэдактар часопіса „TAXI“ Сяргей Стэльмашонак раз на два дні будзе публікаваць рэпартажы аб сваіх уражаннях ад падарожжаў па Германіі:*
*https://www.facebook.com/profile.php?id=100001498277359*